Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (599) Пятніца, 23 красавіка 1965 г. Год выдання XVIII-ы Цана 1 кап.

## У РАЗЛІВЕ

Кажуць, слядоў не кідае ні човен імклівы,
Ані вясло, што крыло па-над плынню ўзаўе...
Бачу я: Ленін вяслуе ў зацішак Разліву,
Хваля з-пад вёслаў ягоных
у сэрца мне б'е!..
Кажуць, ссячы — і не будзе больш дрэваў
шумлівых,
Лісце завяне і вецце дажджом спарахніць...
Ссеклі бярозы калісь на будан у Разліве,
Лісце іх, бронзай ажыўшы, і сёння звініць!..
Кажуць, сплыве агонь з дымам сіне-гаркавым...
Ленін касцёр тут расклаў, прасвятліўшы прастор,
Аб рэвалюцыі думаў над ім, аб дзяржаве, —
Зарою світальнай гарыць над зямлёй той касцёр!..

А. ЛОЙКА.



НА ЗДЫМКУ: Ул. І. Ленін.

## ПРАВАДЫРУ ПРЫСВЕЧАНА

По ініцыятыве выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін было вырашана правесці ў гэтым годзе І навуковую канферэнцыю маладых вучоных універсітэта, прысвечаную 95-й гадавіне з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Гэтая ініцыятыва выклікала шырокую цікавасць. Падзяліцца вынікамі сваіх даследаванняў прыйшла дацэнт С. А. Лысенка, старшыя выкладчыкі Ю. А. Гусеў, М. А. Майракаў, асістэнт Р. А. Малюковіч — усяго 70 чалавек.

Па рашэнню аргкамітэта было арганізавана 5 секцый: эканамічная, філасофская, гістарычная, беларускай і рускай мовы, беларускай і рускай літаратуры.

Работа канферэнцыі працягвалася 3 дні. На пасяджэннях секцый было заслухана шмат змястоўных дакладаў на розныя тэмы, якія выклікалі ажыўлены абмен думкамі.

На эканамічнай секцыі цікавы даклад аб уплыве інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі на рост рэнтабельнасці калгаснай вытворчасці зрабіў выкладчык палітэканоміі Ул. А. Кулажанка.

Аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі С. І. Дзерышаў выказаў цікавыя думкі па праблеме суадносін філасофіі і канкрэтных навук.

Я. М. Русакова прысвяціла свой даклад выказванням Ул. І. Леніна аб асноўных прынцыпах ідэалагічнай работы партыі сярод працоўнага сялянства.

Пасля работы секцый адбылося заключнае, пленарнае пасяджэнне. Прарэктар па навуковай рабоце В. І. Сцяпанаў адзначыў, што маладыя вучоныя універсітэта працуюць над праблемамі, якія маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне.

Канферэнцыя паказала, што універсітэт з'яўляецца кузняй навуковых кадраў, якім па плячу складаныя задачы грамадска-палітычных і гуманітарных навук.

І. СЯРГЕЕЎ,
старшыня аргкамітэта.

## Я ВУЧУСЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ ЛЕНІНА

Студэнткай я стала не адразу. Школу скончыла ў 1955 годзе, спрабавала паступаць ва універсітэт, але... наперадзе мяне чакала няўдача — я не прайшла па конкурсу. Нічога не заставалася рабіць, як ісці на працу, каб потым зноў спрабаваць свае сілы ў вучобе.

І вось надышоў час, калі я стала студэнткай БДУ імя Ул. І. Леніна. Будучая мая прафесія—хімік.

Кожны раз вечарамі, пасля працы на заводзе, я спяшаюся ва універсітэт. Вось ужо амаль год гасцінна адчынены перада мной дзверы «храма навукі». Я ганаруся тым, што мне выпала шчасце вучыцца ва універсітэце, які носіць імя вялікага правадыра народаў свету Ул. І. Леніна.

З. БАЗЫЛЁВА,
студэнтка 1 курса вяч. аддз. хімфака.

## НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

*Гэта было ў час зімовых канікул 1965 года. Разам з савецкімі таварышамі мы ехалі ў Ленінград на экскурсію. З газет, часопісаў, кніжак я ўжо многа ведаў аб гэтым прыгожым горадзе. Там жыў, працаваў Уладзімір Ільіч Ленін, там пачалася Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя.*

*У Ленінградзе мы бачылі вельмі многа цікавага. Асабліва ўражанне зрабіла на нас станцыя Разліў, шалаш, у якім жыў геніяльны Ленін пад выглядам касца. У Леніна была каса, граблі, сякера, кацялок— усё, што трэба было мець касцу. Нялёгка там было жыць і працаваць. Але правадыр партыі і народа быў заўсёды вясёлым, бодрым. Калі ж жыць там зрабілася небяспечна, Ленін па заканчэнню сенакоса перабраўся ў Фінляндыю.*

*Тик больш трох з паловай месяцы Ленін жыў і працаваў для народа ў глыбокім падполлі. Я на ўсё жыццё захаваю ў памяці тое, што чуў і бачыў у горадзе Леніна аб Леніне.*

*АНТВІ АДДЖЕЙ МОСІС,*
*студэнт з Ганы.*

## ЦВІЦІЦЕ, ВІШНІ

Чакаю я:
Вось вішні зацвітуць.
Ад іх пялёсткаў
Будзе свет у захапленні,
Палюбавацца вішнямі прыдуць
Надзежда Крупская,
А з ёю — Ленін.
Прыду і я...
Ты,
беласнежны рой —
Мая рамантыка,
Мой свет
І захапленне.
Цвіціце, вішні!
З вамі мой настрой
Ад думкі,
Што глядзеў на вас
І Ленін.

Ул. ДЗЮБА.

## Да Леніна

**У АЎТОБУСЕ** ганцы, кубінцы, в'етнамцы—студэнты з усіх факультэтаў нашага універсітэта. Мы едзем па Ленінскіх мясцінах.

Фінляндскі вакзал... 3 красавіка 1917 года Ул. І. Ленін вярнуўся сюды з эміграцыі. Вось з гэтых ступенек параднага ганка вакзала сказаў ён прамову перад сустракаючымі яго рабочымі, салдатамі і матросамі. Пасля падняўся на бранявік і вітаў Сацыялістычную рэвалюцыю. Адзін з момантаў выступлення Леніна з бранявіка ўвасоблены ў граніце. Узмах яго рукі застаўся ў нашай памяці назаўсёды.

Тут, у Смольным, была спальня і рабочы кабінет Ільіча. Уважліва мы аглядаем гэты пакой. За перагародкай, якая зроблена з дошчак і не даходзіць да столі, — шафа, пад шэрымі байкавымі коўдрамі — два жалезныя ложкі з матрацамі, набітымі саломай. У вуглу — цагляная печка... Перад нашымі вачыма паўстае жывы воблік Ільіча, яго жыццё, звязанае з лёсам соцень простых людзей, яго здзіўляючая працаздольнасць, энергія, смех...

Доўгі час жыў Ільіч на станцыі Разліў, у старога бальшавіка, рабочага Сестрарэцкага завода І. А. Емяльянава. Ціхі завулак вёскі. Справа стаяць высокія бярозы і ёлкі. Злева, сярод кустоў, на беразе невялікай рэчкі — аднапавярховы домік з чатырма вокнамі. А ў двары, на гары хлява, зробленага з дошчак, Ленін правёў некалькі дзён. Праз адкрытыя дзверы паддашка відаць стол, на ім — чарнільніца. Як добра, што час захаваў для нас усё гэта! Ёсць тут нешта сімвалічнае: стаіць гэты будынак, нягледзячы на ўсе непагоды.

А крыху далей — шалаш з голляў і сена, у ім Ільіч гутарыў з Дзяржынскім і Шотманам. Гэта тут Ул. І. Ленін напісаў свае геніяльныя работы «Дзяржава і рэвалюцыя», «Да лозунгаў», «Аб канстытуцыйных ілюзіях» і многа іншых.

Мы ціха крочым па лузе. Нашы студэнты Анатоль Ярохін, Валера Аносаў, Анатоль Ляпёхін, Святлана Жукава, Міша Лагун далі клятву жыць запаветамі Леніна.

З імем, жыццём і дзейнасцю Ул. І. Леніна ў Ленінградзе звязана 270 мясцін. Нам удалося пабываць на многіх з іх. Памяццю аб Леніне ў Ленінградзе жыве кожная вуліца, плошча. Вобраз Леніна сустрэў нас на Выбаргскай старане і за Нарвскай заставай і на старэйшых прадпрыемствах горада. Сваёй паездкай мы яшчэ больш даведаліся аб Леніне, нам яшчэ багацей адкрыўся яго вобраз.

А. КАДЗЕТ,
студэнт аддзялення журналістыкі.



На здымку: студэнты нашага універсітэта ля гістарычнага помніка Ленінскага «Шалаша». Фота А. Кадзета.

# Імя Леніна ў сэрцах нашых



**На здымку:** камсамольцы — удзельнікі 1-га з'езда РКСМ у Ул. І. Леніна. Малюнак заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР **П. Васільева.**

## НОВЫЯ СТАРОНКІ КІНАЛЕНІНІЯНЫ

**Час няздольны зацягнуць перад намі светлы воблік Ул. І. Леніна. І ў гэтым немалая заслуга кіно. Яно дало магчымасць людзям многіх пакаленняў убачыць Ільіча, сустрэцца з ім, пазнаць яго.**

**Нягледзячы на цяжкі стан кінематаграфіі ў першыя гады Савецкай улады, пры жыцці Ул. І. Ленін быў зняты на плёнку каля дваццаці разоў у часе выступленняў на мітынгах, кангрэсах і з'ездах, сустрэчах з дзеячамі навукі. Многія з іх цяпер дэманструюцца ў розных фільмах пра Леніна і рэвалюцыю.**

**У сярэдзіне дваццатых гадоў савецкія кінематографы зрабілі першыя спробы стварыць вобраз Леніна мастацкімі сродкамі. У некаторых эпізодах ён сустракаўся на экранах у фільме С. М. Эйзенштэйна «Кастрычнік» і некаторых іншых. У пачатку 30-х гадоў праспяваў свае выдатныя «Тры песні пра Леніна» кінапубліцыст-наватар Дзвіга Вертаў. У паэтычнай форме яму ўдалося паказаць, як неўміруча ў народзе памяць аб Леніне, як яго ідэі і запаветы ператвараюцца ў жыццё воляй і працай народа.**

**Кінематаграфісты нібы нанава адкрылі людзям Ільіча, калі ў 1937—38 гадах выпусцілі такія выдатныя фільмы, як «Чалавек з ружжом», «Ленін у 1918 годзе», «Ленін у кастрычніку». На экранах з'явіўся Ленін-правадыр і арганізатар мас. Асаблівыя рысы характару Леніна раскрываліся потым у многіх фільмах. Але твораў, роўных гэтым па сваёй, ідэйна-мастацкай сіле, доўга не было.**

**За апошнія гады на экраны выйшла некалькі цікавых фільмаў аб Леніне: «Апавяданні пра Леніна», «Апасіяната», «Сіні сшытак». У іх раскрыты новыя старонкі жыцця дарагога нам чалавека, новыя якасці яго шматграннай натуры. Многае пра ленінскі геній сказалі нам вылучаныя на ленінскую прэмію навукова-папулярныя фільмы «Сцяг партыі», «Рукапісы Леніна», «Ленін (апошнія старонкі»). Зараз нас чакаюць новыя сустрэчы з Ільічом. На экраны выходзяць фільмы пра родных і блізкіх Леніна, пра яго юнацкія гады, пачатак рэвалюцыйнай дзейнасці. Але найбольшую цікавасць, відаць, маюць кінастужкі «Ленін у Польшчы» і «На адной планеце», дзе ў ролі Леніна выступаюць выдатныя майстры мастацтва М. Штраух і І. Смактуноўскі.**

**Е. БОНДАРАВА.**

КНІЖКІ НАШЫХ АЎТАРАЎ

## ЧАРОЎНАЯ ПЕСНЯ ПРА ЛЕНІНА

*Над вішнёвай мяцеліцай квецені чуецца чароўная песня жаўранка, якая, нібы званочак, устрывожыла вясновае неба. Менавіта так уяўляюць многія паэты і пісьменнікі тую красавіцкую пару шумеўшую белай квеценню садоў, у якую нарадзіўся дарагі і блізкі нашаму сэрцу Уладзімір Ільіч Ленін. Па-свойму чароўна і прывабна ўяўляе сабе Ільічову вясну пісьменнік Павел Ткачоў у сваёй новай кнізе «Вішнёвая квецень».*




*Што ж з'яўляецца адметнай рысай новай кніжкі пісьменніка? Возьмем хоць бы апавяданне, назва якога паслужыла і назвай для самой кніжкі Паўла Ткачова.*

*Па-майстэрску, цёпла расказвае ён аб пачуццях маленькага хлопчыка Андрэйкі, які шкадуе, што не змог разам з дарослымі завезці ў падарунак Леніну сваю вішаньку.*

*— Малы ты яшчэ, — кажа яму бацька. — Падрасці крыху, тады і паедзем са мною...*

*У некалькіх паэтычных, майстэрскіх штрыхах пісьменнік паказвае перажыванні Андрэйкі, які чакае звароту свайго бацькі ад Леніна. Хвалюецца Андрэйка, яму не церпіцца даведацца ад бацькі, як там жыве Ленін.*

*Праз усё апавяданне Павел Ткачоў праводзіць жыццёсцвярджальнасць, неўміручасць любімага правадыра. Відавочна, не давялося Андрэйку з'ездзіць у госці да Леніна. Маленства яго прайшло, а за гэты час не стала і Ільіча.*

*Але затое як красамоўна паказвае пісьменнік бяссмерце Леніна, якое ён увасабляе ў вобразе вішнёвага сада.*

*Шуміць белая вішнёвая замець і ўжо да таго сада прыязджае не Андрэйка, а Андрэй Пятровіч палюбавацца Ленінскім вішнёвым садам.*

*Праз усю кнігу пісьменнік праводзіць ідэю любві Леніна да дзяцей. З цеплынёй і лірычнасцю падкрэслівае ён гэтую выдатную рысу правадыра.*

*З асаблівай сілай гучыць інтэрнацыянальны голас пісьменніка ў апавяданні «Слёзы старога рыбака». У гэтым апавяданні праз вобраз Антоніо паказана любоў італьянскага народа да Леніна.*

*Свежа і па-своему змог пісьменнік паказаць адносіны дзяцей да Ільіча ў апавяданнях «Верачкіна ўсмешка», «Наказ Ільіча», «Янка едзе ў Маскву», «Петрусёў гальштук» і многіх іншых.*

*Кніжка «Вішнёвая квецень» — добры падарунак малодшаму чытачу, дый не толькі малодшаму, — з вялікай ахвотай яе прачытае ўсякі дарослы.*

*Разросся вішнёвы сад у Ленінскіх Горках. Кожную вясну, як і раней, шуміць белай мяцеліцай вішнёвая квецень — знак вялікай, невычарпальнай любві нашага народа да Ільіча.*

*К. МОХАР,*

## НА АБАРОНЕ ГОРАДА ЛЕНІНА

**У гэтую марозную зіму 1941 года гурбы снегу, завалы пакрылі вуліцы Ленінграда. У дамах, цэхах—усюды лёд. Няма святла, няма вады. На вуліцы ціха, навокал—ні душы. Толькі часта гудуць сірэны. А пасля іх трывожных заклікаў у небе паяўляюцца чорныя груганы—варожая авіяцыя. Разрывы бомбаў і снарадаў парушылі цішыню. Здавалася, што горад мёртвы. Бо немагчыма тут быць чаму-небудзь жывому, у гэтым дыме, агні, выбухаў бомбаў. Але калі добра прыглядзецца, ў глыбіню руін, там нехта корпаецца, стукаюць малаткі ў цэху, гудуць станкі—гэта людзі горада Леніна рамантуюць зброю, танкі, робяць снарады.**

**Стаіць Ленінград—сімвал рускай славы ў бушуючым моры вайны. Уся краіна, увесь свет сачыў за ленінградскай эпапеяй. Ад ленінградцаў патрабавалася вялікая мужнасць, каб стрымаць націск фашысцкіх армій. Але трымаўся горад Леніна.**

**Гераізм тых дзён здзіўляе нас. Калі мы чытаем аб героях Брэста, то іншы раз узнікае думка: «Ці так усё было!» А яно было і было на многа ярчэй, чым напісана ў кніжках. Яшчэ не знойдзены тыя простыя яркія фарбы, якімі можна было б апісаць гэты гераізм і можа гэта таму, што героі ў жыцці бываюць простымі, сціплымі людзьмі. Памятаю, быў у нас агульны любімец, смелы і рашучы памочнік камісара батарэі Цыганкоў. Ён пад шквальным агнём ворага прабіраўся ад аднаго гарматнага разліку да другога, сваёй храбрасцю ўзнімаў баявы настрой салдат. Гэтую яго якасць цанілі ўсе. Калі салдаты доўга знаходзяцца без замены на пярэднім краі, у іх ствараецца ўражанне адарванасці ад навакольнага жыцця, стамляецца нярвовая сістэма. І калі вось у такі час прыходзіў да нас Цыганкоў і расказваў цікавыя гісторыі,—у нас зноў узнімаўся баявы дух.**

**Ля сцен Ленінграда стаялі свежыя арміі Гітлера. Атрыманы сакрэтны загад: «Сцерці С-Пецярбург з твару зямлі. Пасля паражэння Савецкай Расіі няма ніякага сэнсу, каб існаваў гэты горад... Блакіраваць горад, весці штодзённы абстрэл з гармат усіх калібраў, бесперапынна бамбіць з паветра...»**

**Становішча на Ленінградскім фронце было вельмі цяжкім. І гэта мы ўсё разумелі. Толькі адных памёршых ад голаду было столькі, што халадзела сэрца. У цябе, чытач, ёсць знаёмыя, якія перажылі блакаду. А калі не—можа сустрэнеш «блакадца», то запытай у яго:**

**— А чаго чакалі вы! Можа таго, што немцы зоймуць горад!**

**Упэўнены, што адказ будзе такім:**

**— Не, мы верылі, што фашысты ніколі не ўвойдуць у горад.**

**Верылі ў перамогу людзі, верылі мы. Месяц за месяцам узводзілі фашысцкія арміі ўсё новыя і новыя ўмацаванні вакол Ленінграда. Прыйшла вясна. Голад, бамбёжкі, абстрэл, цяжкія баі многа ўнеслі абаронцаў.**

**Але тыя, што засталіся жывымі, стаялі з яшчэ большай мужнасцю. Кожны з іх стаў утрая мацнейшым, чым быў раней. Ленінград застаўся для фашыстаў усё той жа грознай крэпасцю, якой яны так і не змаглі ўзяць.**

**Нарэшце, наступіла раніца 12 студзеня 1943 года. У 9 гадзін 30 хвілін пачалося наша вялікае наступленне пад Ленінградам. А праз шэсць дзён блакада была прарвана. Прарвана, толькі не знішчана. Вораг бясконца атакуе—хоча закрыць прарыў, але дарэмна, выстаялі ленінградцы.**

**Наступіў 1944 год. І 27 студзеня 324 гарматы апавясцілі аб поўным зняцці блакады, аб вялікай перамозе Савецкай Арміі пад Ленінградам.**

**М. П. ЯРУГІН,**
**доктар фізіка-матэматычных навук, акадэмік.**

## ЛЕНІНСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ



*На здымку (злева направа): А. А. КАРАБАН (III курс хімфака), Ф. Л. ВАРАНКОВІЧ, (IV курс гістфака), В. М. ЧАРНАГУЗАЎ (III курс біяфака).*

**З 14 па 17 красавіка 1965 года ў нашым універсітэце адбылася метадычная канферэнцыя па пытаннях вячэрняга і завочнага навучання.**

**На пленарным пасяджэнні 14 красавіка выступіў рэктар універсітэта прафесар А. Н. СЕЎЧАНКА.**

**На секцыйным пасяджэнні выступіла 14 дакладчыкаў па філалагічнай секцыі, 8 — па юрыдычнай, гістарычнай і геаграфічнай, 5 — па фізічнай, 4 — па біялагічнай, 3 — па секцыі кафедраў грамадскіх навук, секцыі замежных моў, хімічнай і матэматычнай.**

**На пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі іншых ВНУ рэспублікі.**

**А. КЕРЖАНЦАВА.**

**Рэдактар П. П. СІЛІВАНЧЫК.**

АТ 2372 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. 484.